САНІТАРНЫЯ
ВЕДЫ —
У МАСЫ

М. А. ЦІШЧАНКА

# ПІГМЕНТНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА СКУРЫ І ІХ ЗЛАЯКАСНАЕ ПЕРАРАДЖЭННЕ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»
МІНСК 1976

РЭСПУБЛІКАНСКІ ДОМ САНІТАРНАЙ АСВЕТЫ
МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БССР

САНІТАРНЫЯ ВЕДЫ — У МАСЫ

М. А. ЦІШЧАНКА, прафесар

# ПІГМЕНТНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА СКУРЫ І ІХ ЗЛАЯКАСНАЕ ПЕРАРАДЖЭННЕ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»
МІНСК 1976

617.8
Ц 75

## ЗМЕСТ

Агульная характарыстыка пігментных утварэнняў 5
Небяспечныя і шкоднадзеючыя фактары . . . . . 11
Прыкметы злаякаснага перараджэння пігментных плям у меланому . . . . . . . . . . . . . . . 17
Іншыя захворванні скуры . . . . . . . . . . . 23
Метады распазнавання пігментных плям і меланом 26
Спосабы лячэння пігментных утварэнняў скуры . . 28

*Надрукавана па заказу*
*Рэспубліканскага Дома санітарнай асветы*

© Рэспубліканскі Дом санітарнай асветы
Міністэрства аховы здароўя БССР, 1976

Ц $\frac{51800}{\text{М } 301(05)\text{-}76}$

Амаль ва ўсіх людзей ёсць радзімыя пігментныя плямы, якія ніякай карыснай ролі ў арганізме не адыгрываюць, а хвалявання могуць прычыніць шмат.

Што ўяўляюць яны з сябе? Рудыментарныя ўтварэнні, дайшоўшыя да нас ад нашых продкаў, як, напрыклад, валасяное покрыва на пэўных частках цела, ці недахопы развіцця, якія прырода яшчэ канчаткова не ліквідавала?

Тое, што ў людзей пігментныя плямы і месца іх размяшчэння розныя, дазваляе адносіць гэтыя ўтварэнні да нейкіх недахопаў, ці анамалій, развіцця. Пігментныя плямы ў пераважнай большасці выпадкаў размяшчаюцца ў людзей у тых месцах, што і ў іх бацькоў. Гэта ўказвае на спадчынную прыроду ўзнікнення пігментных утварэнняў. Здараецца, што пігментныя плямы поўнасцю супадаюць па форме і памеру не толькі ў бацькоў і дзяцей, але і ўнукаў. Такое надзвычайнае падабенства гэтых плям на працягу некалькіх пакаленняў у народзе прынята расцэньваць як перадачу шчасця дзецям ад бацькоў. Магчыма, у сувязі з гэтым пігментныя плямы, або радзімыя знакі, лічацца недатыкальнымі, і ў гэтым ёсць глыбокі сэнс.

Сапраўды, спакойныя радзімыя знакі нічым сябе не праяўляюць і з імі людзі дажываюць да глыбокай старасці. Аднак чапаць іх не рэкамендуецца, дзе б яны ні

размяшчаліся. Яны самі могуць траўмавацца, запаляцца і нават перараджацца ў надзвычай злаякасную пухліну — меланому. Небяспечнасць перараджэння гэтых плям значна ўзрастае пад уздзеяннем розных траўм і раздражненняў.

У некаторых выпадках радзімыя знакі, размешчаныя на твары, прыдаюць чалавеку асаблівую прывабнасць ці, як прынята гаварыць, сімпатыю. Такія радзімкі часам нават падфарбоўваюць, каб выдзеліць іх на шчацэ, верхняй губе ці лбе, як гэта робяць, напрыклад, індусы. Радзімкі ж значных памераў на падбародку, шыі, вісках людзі, асабліва маладыя, наадварот, імкнуцца якнебудзь прыхаваць. Юнакі маскіруюць іх валасамі, барадой, дзяўчаты — адпаведнай прычоскай, адзеннем ці галаўным уборам. Усё гэта дапушчальна і зразумела. Часам жа ў пагоні за знешнім выглядам некаторыя асобы імкнуцца выдаліць ці знішчыць тым або іншым спосабам радзімыя знакі, што можа прывесці да трагічных вынікаў у выпадку развіцця меланомы. Гэта павінен ведаць кожны чалавек, каб перасцерагчы сябе і тых, хто яго акружае, ад легкадумных і небяспечных маніпуляцый з радзімымі знакамі.

Аб патэнцыяльнай небяспечнасці пігментных плям і пойдзе размова ў брашуры.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПІГМЕНТНЫХ УТВАРЭННЯЎ

Прыроджаныя, ці спадчынныя, пігментныя плямы ў народзе звычайна называюць радзімкамі, а ў медыцыне — невусамі. Амаль ва ўсіх людзей (каля 98 працэнтаў) ёсць радзімкі, якія часцей за ўсё размяшчаюцца на скуры, але могуць знаходзіцца і на слізістых абалонках губ, шчок, вачэй і нават некаторых унутраных органаў.

Другой разнавіднасцю пігментных утварэнняў з'яўляюцца набытыя невусы. Яны ўзнікаюць у розныя тэрміны пасля нараджэння. Называць іх радзімкамі будзе няправільна. Сустракаюцца гэтыя плямы радзей, чым радзімкі, але часцей перараджаюцца ў меланому, гэта значыць працякаюць значна небяспечней. Тлумачыцца гэта тым, што гэтыя два віды плям маюць розную ступень спеласці. Абедзве разнавіднасці пігментных плям як па форме, так і па афарбоўцы могуць супадаць. Прагноз жа пры іх, як ужо адзначалася, розны. Таму вельмі важна ўмець іх размежаваць, устанавіць, які знак прыроджаны, а які набыты пры жыцці.

Адрозніць радзімыя знакі ад з'явіўшыхся пазней пігментных плям даволі проста. Радзімыя знакі, паколькі яны зараджаюцца яшчэ ў перыяд унутрычэрыўнага развіцця плода, аказваюцца спялейшымі, гэта значыць больш дыферэнцыраванымі ў параўнанні з пігментнымі плямамі, якія ўзнікаюць у чалавека праз нейкі перыяд

пасля нараджэння. Знешняй прыкметай высокай дыферэнцыраванасці часта з'яўляецца наяўнасць валасянога покрыва на паверхні плям, а таксама тлушчавых і потавых залоз. Але апошнія размяшчаюцца даволі глыбока і простым вокам звычайна не бачны. Значыць, калі на пігментнай пляме прыкметны хоць адзін валасок, а іх часам бывае шмат, то яе без усякага сумнення трэба адносіць да прыроджанай, гэта значыць да сапраўднай радзімкі, якая звычайна працякае спакойна.

Калі ж пігментная пляма з'яўляецца ўпершыню ў дарослага чалавека, то гэтаму, мабыць, садзейнічае нейкая прычына, якая непрыкметна можа працягваць сваё дзеянне, аж пакуль з плямы не разаўецца злаякасная пухліна — пігментная меланома.

Вось чаму кожны чалавек павінен ведаць аб усіх сваіх пігментных утварэннях на скуры.

Радзімкі часцей бываюць плоскай, круглай ці паўавальнай формы з выразнымі берагамі, могуць злёгку ўзвышацца над паверхняй скуры. Памеры іх звычайна невялікія — ад некалькіх міліметраў да 1—2 сантыметраў. Афарбоўка радзімак можа быць самай разнастайнай: ад светла-блакітнай да цёмна-карычневай і нават чорнай. Яна залежыць ад колькасці і глыбіні размяшчэння пігменту.

Часам сустракаюцца барадаўчатыя і плоска-бугарчатыя валасатыя невусы блакітнай ці сіняватай афарбоўкі. Такая афарбоўка тлумачыцца тым, што пігмент размяшчаецца глыбока ў скуры і, прасвечваючыся праз слой стончанага эпітэлію, набывае блакітнае адценне.

Валасяное покрыва на паверхні такіх радзімак бывае розным як па колькасці, так і па памерах, колеру. Звычайна прыкметны адзін валасок у сярэдзіне радзімкі, якая злёгку ўзвышаецца. Часам валасок бывае значнай даўжыні і нават завіваецца. Людзі часта вырываюць такі валасок з коранем, каб ён больш не рос. Гэтым таксама ствараецца небяспечнае раздражненне радзімкі.



Рыс. 1. Прыроджаны невус

У такіх выпадках лепш яго абстрыгчы, а самую радзімку не чапаць і не раздражняць.

Памеры барадаўчатых радзімак у асноўным большыя, чым плоскіх. Пры гэтым чым большая і вышэйшая такая радзімка, тым яна звычайна менш пігментаваная і можа нават мець афарбоўку скуры. Гэта так званыя безпігментныя радзімкі, хоць валасяное покрыва на іх паверхні заўсёды ёсць і нярэдка значных памераў.

Асаблівую разнавіднасць уяўляюць вялікія бугарчатыя набытыя невусы цёмна-карычневага колеру ці зусім чорныя з густым валасяным покрывам. Звычайна такія невусы размяшчаюцца на спіне, пераважна ў паясночнай вобласці. Як правіла, яны пакрыты густымі і доўгімі чорнымі валасамі, якія часта звісаюць ніжэй самога невуса (рыс. 1). Не выпадкова такое валасяное покрыва параўноўваецца з формай конскага хваста.

Мы назіралі жанчыну ва ўзросце 28 гадоў, у якой набыты невус размяшчаўся на спіне і крыжы. Велічынёй ён быў з далонь і пакрыты густымі чорнымі валасамі. Валасы хутка раслі, звісалі ўздоўж ягадзічнай складкі і раздражнялі скуру прамежнасці. Жанчына вымушана была перыядычна стрыгчы гэтыя валасы. Звярнуцца да ўрачоў за парадай яна саромелася і зрабіла гэта толькі тады, калі нарадзіла здаровае і без аналагічных радзімых знакаў дзіця.

Такія вялікія пігментныя невусы з густымі валасамі і зморшчанай, літаральна «слановай» скурай могуць узнікаць адначасова на розных частках цела і нават сіметрычна на ягадзіцах ці лапатках. Апісаны выпадак, калі ў 22-гадовага мусульманіна гіганцкі пігментаваны валасяны невус пакрываў шыю, плечы, правую лапатку і частку спіны. Апрача таго, у яго было яшчэ каля 150 невялікіх пігментных плям.

Вялікія радзімыя знакі звычайна з'яўляюцца ў высокай ступені спелымі і амаль ніколі не пераараджаюцца ў злаякасныя пухліны. Размяшчаюцца яны пераважна на тых частках цела, якія прыкрываюцца адзеннем. Паколькі гэтыя плямы сябе нічым не праяўляюць, то ў такіх выпадках ніхто, можна сказаць, не звяртаецца за медыцынскай дапамогай. Наадварот, людзі саромеюцца іх паказваць. Аднак трэба мець на ўвазе, што гэтыя плямы могуць таксама раздражняцца і запальвацца, а гэта ўжо небяспечна.

Калі ў дзяцей ёсць такія плямы, то бацькі павінны пракансультавацца з урачом наконт іх як мага раней, таму што з узростам яны могуць павялічвацца, а магчыма, і ўскладняцца.

Параўнальна рэдкай формай з'яўляюцца галінастыя шматдольчатыя пігментныя разрастанні, якія падобны на тутавую ягаду ці гронку вінаграду. Звычайна такія невусы маюць выгляд папіломы на вузкай ножцы і звісаюць. Яны мяккія навобмацак, нярэдка з чырванава-

тым адценнем, што прыдае ім выгляд сасудзістай пухліны — ангіёмы, але могуць мець цёмна-карычневую афарбоўку і месцамі нават чорную. Размяшчаюцца такія невусы пераважна на шыі, грудной клетцы, спіне, жываце, у сувязі з чым часта траўмуюцца, кровоточаць, запальваюцца і могуць перараджацца ў злаякасныя пухліны, асабліва калі іх спрабуюць выдаліць перавязаўшы ніткай ці звычайным зразаннем.

Набытыя пігментныя плямы, як ужо адзначалася, менш спелыя і не ўтрымліваюць прыдаткаў скуры. Валасяное покрыва на іх звычайна адсутнічае, хоць па форме і афарбоўцы яны нагадваюць радзімыя знакі (рыс. 2). За такімі плямамі неабходны асабліва пільны нагляд. Трэба звяртаць увагу на іх дынамічнасць і інтэнсіўнасць афарбоўкі. Гэтыя плямы адрозніваюцца ад радзімых знакаў па форме і памерах. Часцей за ўсё яны бываюць паўавальнымі ці круглымі, часам плоскімі, з гладкай паверхняй і толькі злёгку выступаюць над узроўнем скуры. Памеры іх невялікія, да аднаго сантыметра ў дыяметры. Звычайна гэтыя плямы адзіночныя, узнікаюць на твары, шыі, руках, нагах, значна радзей — на тулаве, карацей кажучы, на тых месцах, якія ў большай меры падвяргаюцца знешнім уздзеянням, раздражненням, што, магчыма, і прыводзіць да іх развіцця. У месцах udaраў і рубцоў таксама могуць з'яўляцца пігментныя плямы. Нярэдка ў мужчын пры паўторных траўмах скуры ў час галення ўзнікаюць такія плямы.

Трэба адзначыць, што радзімыя знакі ў перыяд росту і развіцця чалавека могуць некалькі павялічвацца і змяняць афарбоўку. Асабліва прыкметны рост гэтых плям назіраецца ў перыяд палавой спеласці. У пажылым узросце могуць адзначацца змяненні адваротнага напрамку.

Дынамічнасць пігментных утварэнняў у залежнасці ад узросту людзей указвае на тое, што натуральныя змяненні ў прыроджаных плямах абумоўлены гарманальным



Рыс. 2. Набытыя пігментныя плямы

станам арганізма, які ў сваю чаргу залежыць ад узросту і нават полу людзей.

Пігментныя ўтварэнні на скуры ў жанчын назіраюцца часцей, чым у мужчын. У дзяўчынак у перыяд палавой спеласці радзімыя знакі становяцца асабліва яркімі, гэта значыць насычаюцца пігментам. У цяжарных жанчын наогул павялічваецца пігментны абмен і ўсе радзімкі не толькі цямнеюць, але і прыкметна павялічваюцца ў памерах. Пасля родаў, калі ўсе функцыі ў маці нармалізуюцца, радзімыя знакі набываюць ранейшы выгляд. Тым не менш у час цяжарнасці, як і ў перыяд палавой спеласці, часам узнікаюць настолькі бурныя змяненні ў пігментных плямах, што могуць прывесці да злаякаснага іх перараджэння, гэта значыць да развіцця меланомы.

Аднак галоўнай прычынай злаякаснага перараджэння пігментных плям з'яўляецца не столькі ўзмацненне пігментацыі, колькі ўзнікаючая часам здольнасць іх змя-

няцца пад уплывам эндакрынных (унутраных) фактараў ці розных знешніх неспрыяльных уздзеянняў. Так, у пажылых людзей пасвятленне пігментнай плямы не менш небяспечна, чым у юнацкім узросце прыкметнае яе пацямненне. Змяненне афарбоўкі пігментнай плямы ў той ці іншы бок: блакітнай у сінюю, карычневай у абсалютна чорную ці паступовае знікненне пігменту амаль да поўнага прасвятлення — сведчыць аб вялікіх біялагічных зрухах, якія могуць прыводзіць да развіцця пігментнай ці безпігментнай меланомы. Часцей за ўсё гэта назіраецца ў плоскіх і ледзь выступаючых плоска-бугарчатых пігментных плямах. Больш буйныя, барадаўчатыя пігментныя плямы з узростам таксама павялічваюцца, але афарбоўка іх некалькі бляднее.

Павелічэнне радзімага знака нават без якіх-небудзь адчуванняў можа азначаць неспакойнае яго цячэнне, а калі яшчэ пры гэтым змяняецца афарбоўка, то гэта ўжо дзве трывожныя прыкметы. Разам з тым нязначнае павелічэнне пігментных плям у перыяд росту і палавой спеласці можа насіць і чыста ўзроставы характар і ніякай небяспекі не ўяўляць. Але ў гэтым можа разабрацца толькі ўрач.

У жанчын радзімыя знакі, як мы ўжо ўказвалі, больш падвержаны змяненням. Таму ў юнацкім узросце і ў дзетародны перыяд яны павінны час ад часу звяртацца да ўрача, які можа прасачыць за дынамікай пігментных плям.

## НЕБЯСПЕЧНЫЯ І ШКОДНАДЗЕЮЧЫЯ ФАКТАРЫ

Як прыроджаныя, так і набытыя пігментныя плямы надзвычай адчувальныя да розных знешніх раздражненняў: механічных, хімічных, тэрмічных і нават да празмернага абпраменьвання на сонцы.

Нярэдка людзі, асабліва маладыя, у якіх на твары ці тулаве шмат пігментных плям, хочуць нейкім чынам пазбавіцца ад іх. Так, моладзь у летні перыяд стараецца як мага больш загараць. Мала таго, многія з іх імкнуцца яшчэ паехаць куды-небудзь на поўдзень — у Крым ці на Чарнаморскае ўзбярэжжа Каўказа, дзе больш сонечных праменняў.

Аднак працяглае знаходжанне на сонцы нярэдка суправаджаецца значнымі функцыянальнымі расстройствамі, аж да сонечнага ўдару, не кажучы ўжо пра галаўны боль, зніжэнне апетыту і іншыя парушэнні. Трэба ўлічваць і тое, што ультрафіялетавыя праменні сонечнага спектра ў вялікіх дозах могуць аказваць адмоўны ўплыў на арганізм. У прыватнасці, яны садзейнічаюць узмацненню пігментацыі ў прыроджаных і набытых пігментных плямах і нават могуць з'явіцца прычынай іх злаякаснага перараджэння.

Апрача таго, загар не маскіруе поўнасцю пігментных плям, бо з пігментацыяй скуры яны цямнеюць яшчэ больш.

Вось чаму людзям, у якіх ёсць хоць і дробныя нешматлікія пігментныя плямы ці вялікія адзіночныя радзімкі, не рэкамендуецца працяглае знаходжанне на сонцы, а тым больш спецыяльнае загаранне, бо гэта можа прывесці да небяспечнага зыходу.

Адна маладая жанчына звярнулася да нас са скаргай на тое, што ў яе пасля адпачынку на поўдні ўжо два месяцы не праходзіць запаленне пігментнай плямы на шыі. Як высветлілася, у жанчыны з нараджэння была паўавальная пляма ў падключычнай вобласці памерам 3×1,5 сантыметра, якая злёгку ўзвышалася і была пакрыта невялікімі валасамі. У час адпачынку па нечай парадзе жанчына шмат загарала, каб выклікаць злушчэнне скуры. Яна спадзявалася, што пры гэтым знікне пляма, скура потым загарыць і нічога не будзе відаць. Каб лепш загарэць, ёй рэкамендавалі змазваць скуру ней-

кай маззю. Жанчына добрасумленна ўсё выконвала, цэлымі днямі ляжала на сонцы з адкінутай галавой. І сапраўды, на працягу трох дзён скура, што называецца, згарэла і пачала злазіць, а ў некаторых месцах нават з'явіліся пухіры ад апёку. Затым усё паступова загаілася. Некалькі пазней пігментная пляма пачала мокнуць, і жанчына рашыла, што загар дасягнуў мэты — пляма павінна злушчыцца. Але гэтага не адбылося. Пігментная пляма ўвесь час мокла і не злушчвалася, а ад сонца яшчэ больш пацямнела.

Пры аглядзе жанчыны стала зразумела, што пігментная плямаператварылася ў злаякасную пухліну ў выніку працяглай інсаляцыі, калі яна два месяцы назад старанна загарала. Усе дадатковыя метады даследавання пацвердзілі дыягназ меланомы скуры.

Вядома, адпачываць на поўдні можна і людзям, якія маюць пігментныя плямы. Купанне ў моры і адпачынак у цяні без залішняй інсаляцыі карысны ўсім людзям. Аднак асобам, у якіх на скуры ёсць шмат пігментных плям, не трэба ездзіць на поўдзень спецыяльна загараць. Ім мэтазгодней адпачываць у той паласе, дзе яны акліматызаваліся.

Яшчэ больш небяспечны розныя механічныя ўздзеянні, накіраваныя на выдаленне ці выпальванне пігментных плям з касметычнай мэтай. Некаторыя маладыя і нават пажылыя людзі, каб пазбавіцца ад радзімага знака, звяртаюцца да розных народных сродкаў. Так, радзімкі на тонкіх ножках часта перавязваюць ніткай ці воласам у месцы заснавання. Сапраўды, знешняя частка такой радзімкі ад здаўлення сасудаў амяртвляецца, падсыхае і адвальваецца, але аснова, якая знаходзіцца ў самой скуры, застаецца і ад такога раздражнення яшчэ хутчэй пачынае расці. Гэта прыводзіць не толькі да ўзнаўлення радзімкі, але і да больш хуткага яе росту, а нярэдка нават і да злаякаснага перараджэння.

Такія шкодныя маніпуляцыі могуць прывесці да раз-

віцця меланомы, якая звычайна хутка распаўсюджваецца па арганізму. Нам вядомы выпадак, калі муж па просьбе жонкі перавязаў ёй на шыі невялікую цёмную радзімку, якая вісела на ножцы і была ўсяго толькі касметычным недахопам. Праз тры дні пасля перавязкі ніткай радзімка адвалілася, а праз шэсць месяцаў муж застаўся ўдаўцом. Жонка памерла ад бурна развіўшайся меланомы.

Пігментныя плямы і радзімкі надзвычай адчувальны да любых раздражненняў. Іх нельга прыпякаць, зразаць ці перавязваць. Розныя народныя сродкі, якія ўжываюцца з мэтай ліквідацыі невусаў, вельмі небяспечныя для жыцця людзей і не павінны выкарыстоўвацца. Нельга ўздзейнічаць на радзімкі і іншыя пігментныя плямы кіслотамі і шчолачамі, выпальваць іх з касметычнымі мэтамі. Выпальванне пігментных утварэнняў яшчэ больш небяспечна, чым паверхневыя зразанні ці перавязкі. Неабыякавы для радзімак і пігментных плям любыя траўмы. Часам яны нават небяспечны як надзвычай дзейсны фактар для хуткага злаякаснага перараджэння і развіцця меланом. Таму радзімыя знакі, якія пастаянна падвяргаюцца раздражненню каўняром, поясам ці іншымі рэчамі туалету, неабходна выдаляць у спецыяльных установах. У кожным выпадку пасля кансультацыі спецыяліста і праверкі біялагічнага характару пігментных утварэнняў лабараторнымі метадамі павінна праводзіцца радыкальнае выдаленне ці камбінаванае лячэнне іх, якое звычайна ўключае перадаперацыйнае абпраменьванне.

Цяпер амаль ва ўсіх гарадах функцыяніруюць касметычныя кабінеты, дзе вопытныя спецыялісты могуць параіць, калі і як лепш выдаліць радзімку з касметычнай мэтай. Аднак пры падазрэнні на тое, што невус неспакойны, лепш звярнуцца да ўрача ў анкалагічны дыспансер, дзе ёсць усе ўмовы для больш дасканалай дыягностыкі і эфектыўнага лячэння пігментных плям і меланом.

Мы назіралі некалькі выпадкаў развіцця меланом у жанчын з пігментных плям, якія размяшчаліся на галёнках і былі траўміраваны хатнімі жывёламі, птушкамі. Адной жанчыне ў невялікую чорную плямку на галёнцы некалькі разоў дзеўбануў певень. Пасля гэтага пляма крыватачыла, затым з яе ўзнікла меланома скуры.

Другая хворая расказала, што ў яе кот не адзін раз драпаў чорную радзімку наназе. Аднойчы ён скочыў на нагу і кіпцюрамі так пашкодзіў радзімку і скуру, што нават адзначалася крывацячэнне. З таго часу радзімы знак стаў павялічвацца, часта запаляцца і лёгка пашкоджваўся. Жанчына прыкладвала да яго розныя мазі. І ўсе ж у канчатковым выніку развілася меланома.

У гэтых жанчын асноўнай прычынай злаякаснага перараджэння пігментных плям, безумоўна, было неаднаразовае іх траўміраванне.

Калі на аголеных частках ног ёсць цёмныя плямы, то, каб прадухіліць іх ад траўміравання, неабходна насіць панчохі нават летам. У сельскай мясцовасці, каб засцерагчы ад траўм радзімкі на нагах, трэба насіць высокі абутак, а калі яны ёсць і на руках, то мэтазгодна карыстацца рукавіцамі і насіць адзенне з доўгімі рукавамі.

Вядомы выпадкі траўміравання нават злёгку выступаючых пігментных плям на руках і нагах пры ўборцы сена, сціртаванні саломы, малацьбе, нарыхтоўцы дроў і іншых відах сельскагаспадарчых работ. Разагрэтая на сонцы скура, у тым ліку і радзімыя знакі, лёгка траўміруюцца і затым раздражняюцца не толькі механічна, але і хімічна — потам, пылам, дымам у тых, хто курыць, выхлапнымі газамі машын і інш.

Часам траўмы плям на твары ў мужчын наглядаюцца ў час галення, а на валасістай частцы галавы — пры раздзіраннях. У падпахавых і пахвінных частках цела радзімкі нярэдка мацэруюцца і траўміруюцца ад пастаяннага трэння скурай, адзеннем і г. д. Ва ўсіх выпадках

няўдалай лакалізацыі пігментных плям, калі яны пастаянна траўміруюцца, неабходна іх неадкладна выдаляць.

Часта адзначаюцца траўмы радзімак на скуры спіны пры мыцці ў лазні, калі карыстаюцца жорсткай мачалкай ці занадта моцна паляпваюць сябе венікам у апарні, прывычным драпанні рукой чагосьці, што вытыркаецца на спіне, але не відаць простым вокам, а нярэдка звычайным выцісканнем прышчыка, які здаецца безбалесным, і г. д. Адным словам, любое траўміраванне пігментных утварэнняў небяспечна, асабліва пігментных плям.

Такім чынам, са сказанага вышэй вынікае, што да злаякаснага перараджэння невусаў ці пігментных плям прыводзяць самыя розныя прычыны. Каб засцерагчы сябе ад непрыемных вынікаў, неабходна перыядычна агледаць усё цела перад люстэркам, у прыватнасці ў час мыцця. Трэба заўсёды памятаць аб радзімках, якія лакалізуюцца ў недаступных для пастаяннага агляду месцах, і старанна засцерагаць іх ад якога б там ні было раздражнення.

Імавернасць развіцця меланом з радзімак вельмі мізэрная. Прыкладна дзве меланомы ўзнікае на 1 000 000 пігментных плям. Калі ў чалавека ў сярэднім налічваецца да 20 пігментных плям, то захварэць меланомай можа адзін чалавек на 25 000 такіх людзей.

Меланома ўзнікае значна радзей, чым любая іншая злаякасная пухліна скуры, і складае менш як адзін працэнт ад усіх новаўтварэнняў, аднак сярод пухлін скуры яна дасягае 20 працэнтаў. Па частаце развіцця другое месца займаюць меланомы вока, яшчэ радзей меланомы ўзнікаюць на мазгавых абалонках, слізістых абалонках поласцей рота і губ. Гэтыя пухліны могуць выяўляцца ў гартані, трахеі, страваводзе, прамой кішцы, палавых органах, наднырачніках і г. д.

Меланомы, як ужо адзначалася, сустракаюцца параўнальна рэдка, але яны вельмі хутка распаўсюджваюцца па ўсім арганізме, што прыводзіць часцей за ўсё маладых і поўных здароўя людзей да вельмі змрочнага стану.

## ПРЫКМЕТЫ ЗЛАЯКАСНАГА ПЕРАРАДЖЭННЯ ПІГМЕНТНЫХ ПЛЯМ У МЕЛАНОМУ

Паколькі пігментныя плямы даволі распаўсюджаны, то неабходна пазнаёміць насельніцтва з тымі прыкметамі, ці сімптомамі, якія могуць з'явіцца ў самым пачатку неспрыяльных змяненняў у гэтых плямах.

Веданне сімптомаў дапаможа своечасова звярнуцца да ўрача за парадай і медыцынскай дапамогай, а гэта галоўная ўмова прадухілення магчымага перараджэння пігментных плям у меланому і нават паспяховага лячэння яе.

У спакойным стане пігментныя плямы звычайна сябе нічым не праяўляюць. У выпадку ж якога-небудзь адхілення ад нармальнага ў біялагічных адносінах цячэння ў іх могуць з'явіцца як суб'ектыўныя, так і аб'ектыўныя прыкметы, на якія неабходна звяртаць увагу і надаваць ім пэўнае значэнне.

Да суб'ектыўных сімптомаў у неспакойнай пігментнай пляме належаць: з'яўленне свербу, смылення, пашчыпвання ці лёгкага паколвання ў самой пляме. Гэтыя адчуванні звычайна супадаюць з пачырваненнем ці запаленнем самой плямы. Часта і вакол плямы адзначаецца пачырваненне скуры ў выглядзе арэолу ці звілістых ружовых цяжаў. На першы погляд гэта можна прыняць за запаленне. На самай жа справе пачырваненне ўтвараецца не ад пранікнення інфекцыі, а ў сувязі з біялагічнымі зрухамі, якія ўзнікаюць у пігментным утварэн-

ні, у бок больш хуткага яго росту з праліферацыяй у мягчымым месцы злаякаснага перараджэння. Пачырваненне скуры вакол утварэння з'яўляецца ўжо і аб'ектыўным сімптомам неспакойнага цячэння пігментнай плямы ці радзімкі. У сувязі з гэтым трэба прымаць тэрміновыя меры да ўдакладнення неабходнай тэрапіі ў адпаведных умовах.

Другім суб'ектыўным сімптомам неспакойнага цячэння як пігментнай плямы, так і радзімага знака можа быць размякчэнне паверхні, часам з серознымі (сыроватачнымі) выдзяленнямі ці нават кропкавым крывазліццём. У такіх выпадках бялізна прыліпае да паражоных участкаў скуры, пастаянна здзіраецца і траўміруецца пляма нават пры самым акуратным пераапрананні. Пры гэтым агаляецца раневая паверхня, і ў яе пранікае інфекцыя, узнікаюць прыкметы сапраўднага запалення з тупым болем, а нярэдка і з гнойнымі выдзяленнямі. Тэмпература часта застаецца нармальнай. Аднак такія, ужо сур'ёзна хворыя людзі яшчэ доўга не звяртаюць на свой стан увагі, працягваюць працаваць і вядуць звычайны вобраз жыцця. Вельмі небяспечна пры гэтым займацца самалячэннем. Трэба неадкладна звяртацца да ўрача, які зможа ўстанавіць, што гэта — запаленне скуры ці злаякаснае перараджэнне самой плямы.

Да аб'ектыўных прыкмет неспакойнага цячэння пігментнай плямы належаць: павелічэнне памераў, змяненне афарбоўкі, залішняе лушчэнне і з'яўленне бугарчатасці па краі ці ў цэнтры. У выніку хуткай дынамікі ў пляме на яе паверхні могуць нарошчвацца і злушчвацца лускавінкі, узнікаць блакітнаваты абадок ці венчык па перыферыі. Пляма можа пакрывацца болькамі. Часам зацвердзявае яе аснова, з'яўляюцца даччыныя высыпанні ў выглядзе кропкавых сатэлітаў (спадарожнікаў) вакол асноўнай плямы, павялічваюцца блізка размешчаныя рэгіянарныя лімфатычныя вузлы (рыс. 3).



Рыс. 3. Невус, малігнізаваны ў меланому,
з даччынымі высыпаннямі

Кожнае з гэтых змяненняў можна пэўным чынам растлумачыць. Але ўжо сама разнастайнасць прыкмет неспакойнага цячэння ў пляме сведчыць аб тым, наколькі складаныя працэсы адбываюцца ў ёй. Вельмі небяспечна, як мы ўжо адзначалі, хуткае пацямненне плямы, не менш небяспечна і яе прасвятленне. Апошняе можа быць прыкметай развіцця безпігментнай меланомы, якая працякае яшчэ больш каварна, чым звычайныя пігментныя меланомы. Асабліва павінна насцярожваць у адносінах злаякаснага перараджэння невусаў з'яўленне блакітнаватага абадка вакол плямы.

Аднак аналагічны колер маюць і юнацкія блакітныя меланомы, якія працякаюць параўнальна дабраякасна. Практычна гэта блакітнаватыя плямы, якія с самага пачатку ў дзяцей размяшчаюцца на скуры, але значна

глыбей — у самой дэрме, а зверху над імі знаходзіцца слой стончанага атрафіраванага эпітэлію.

Новыя, даччыныя высыпанні ў выглядзе чорных кропак ці цёмных плям, якія звычайна размяшчаюцца паблізу асноўнага невуса, таксама сведчаць аб тым, што адбыліся змяненні не толькі ў ім, але і ва ўсіх пігментных комплексах, утвораных ад яго. Гэта ўжо надзвычай трывожная прыкмета злаякаснага перараджэння невуса і хуткага росту меланомы.

Прыводзім адзін з выпадкаў спалучэння меланомы з сатэлітамі. У хворай Ш., 28 год, на правай галёнцы была прыроджаная пігментная пляма каля сантыметра ў дыяметры. У апошнія тры месяцы гэта пляма стала павялічвацца і крываточыць. Вакол яе ўзніклі цямнейшы, чым сама пляма, абадок і некалькі кропкавых чорных высыпак паблізу яго. У мазках-адбітках з крываточывай паверхні асноўнай плямы былі выяўлены пухлінныя клеткі, якія ўтрымлівалі пігмент. Выказана меркаванне, што гэта меланома. Дыягназ пацвердзіўся, але хворай паспелі правесці радыкальнае лячэнне, і яна жыве ўжо больш як пяць гадоў і працягвае працаваць.

Гэта назіранне павучальнае ў тых адносінах, што на прыроджаны радзімы знак, які падвяргаўся раздражненню панчохай і абуткам, не была своечасова звернута ўвага. У выніку ў жанчыны за такі кароткі тэрмін пасля ўзнікнення запалення ў пляме развілася меланома ўжо з даччынымі высыпаннямі. Да гэтага, несумненна, прывяло пастаяннае раздражненне плямы, якую трэба было выдаліць, што прадухіліла б ад небяспечных для жыцця вынікаў.

Часам мэтазгодна выдаляць і спакойныя пігментныя плямы, асабліва калі яны размяшчаюцца ў тых месцах, якія пастаянна падвяргаюцца раздражненню і часта траўміруюцца. Напрыклад, у мужчын радзімкі на шыі траўміруюцца часцей, чым у жанчын. Тугі каўнер сарочкі і гальштук садзейнічаюць раздражненню пігментных

плям. Жанчыны ж пераважна носяць такое адзенне, што шыя застаецца аголенай. Аднак жанчыны, асабліва маладыя, часам імкнуцца прыхаваць радзімку на шыі з дапамогай асобага каўняра. Гэта можа садзейнічаць раздражненню пігментнай плямы. Але яшчэ больш небяспечна, калі жанчыны знішчаюць радзімку ці барадаўку прыпяканнем або перавязваннем.

На грудной клетцы радзімыя знакі больш раздражняюцца і часцей перараджаюцца ў злаякасныя ў месцах прылягання падцяжак у мужчын, бюстгальтараў у жанчын.

На жываце часцей за ўсё траўміруюцца радзімкі ў месцах прылягання штаноў ці рэменя. Даволі неспрыяльным месцам для пігментнай плямы ці радзімкі з'яўляецца скура сцёгнаў з унутранага боку, дзе нават ад пастаяннага трэння пры хадзьбе можа наступіць злаякаснае перараджэнне іх. Ва ўсіх такіх выпадках неабходна звяртацца да ўрача. Толькі ён можа правільна вызначыць ступень небяспекі з улікам лакалізацыі плямы, яе магчымага раздражнення і даць абгрунтаванае заключэнне аб тым, што рабіць у кожным канкрэтным выпадку.

Неабходна спыніцца і на такім пігментным захворванні скуры, якое называецца прамеланозам Дзюбраа і, як правіла, з часам ператвараецца ў злаякасную меланому.

Прамеланоз часцей за ўсё назіраецца ў пажылых жанчын на твары, руках, нагах, але можа з'явіцца і на слізістых абалонках губы, шчакі, нават павека. Нярэдка ён нагадвае старэчыя вяснушкі. Па знешніх прыкметах — гэта змененыя, з выражанай пігментацыяй участкі скуры, якія злёгку ўзвышаюцца. Памеры іх ад чачавічнага зярняці да 2—3 сантыметраў у дыяметры. Граніцы невыразныя, краі няроўныя, паверхня бугарчатая. Звычайна гэтыя плямы пакрыты шараватымі лускавінкамі. На паверхні такой плямы маюцца як зацвярдзелыя, так і мяк-



Рыс. 4. Прамеланоз Дзюбраа на скуры галёнкі.

кія ўчасткі тканак з рознай афарбоўкай, і ствараецца ўражанне, што гэта пляма нагадвае геаграфічную карту (рыс. 4).

Узмоцненае лушчэнне ўсёй плямы ці толькі скарыначак, з'яўленне болек або зацвярдзенне ў якім-небудзь участку ці краі плямы сведчаць аб магчымым злаякасным перараджэнні.

На скуры чалавека сустракаецца і вялікая колькасць розных бародавак, папілом і іншых разрастанняў, якія да радзімых знакаў і пігментных плям не адносяцца, але насельніцтва павінна ведаць пра іх, таму што яны таксама прычыняюць нямала турбот і абсалютна беспрычынных хваляванняў.

## ІНШЫЯ ЗАХВОРВАННІ СКУРЫ

Адрозніваць сапраўдныя і несапраўдныя пігментныя плямы і радзімыя знакі можна па знешніх прыкметах, якія залежаць ад будовы, глыбіні і месца размяшчэння пухлінных разрастанняў на скуры.

Асобнай разнавіднасцю дабраякасных змяненняў скуры з'яўляюцца светлыя плямы віціліга і цёмныя, так званыя мангольскія, якія часта назіраюцца на твары.

Да дабраякасных змяненняў скуры адносяцца і блакітныя невусы — у асноўным адзіночныя, невялікія, з выразнай граніцай плоскія плямы круглявай ці авальнай формы. Сустракаюцца яны пераважна ў дзіцячым і юнацкім узросце на твары, руках, радзей — на тулаве і ніжніх канечнасцях. Гэтыя невусы, як правіла, працякаюць дабраякасна, а з узростам часта самастойна знікаюць. Аднак пры моцных раздражненнях або розных прыпяканнях яны могуць падвяргацца злаякаснаму пераўтварэнню.

Трэцяй разнавіднасцю дабраякасных змяненняў скуры з'яўляюцца чырвоныя знакі, якія звязаны з анамаліяй развіцця крывяносных сасудаў, кропкавыя, павукападобныя, плоскія і вузлаватыя сасудзістыя змяненні. Адрозніць сасудзістыя плямы ад сапраўдных гемангіём можна такім чынам. Гемангіёмы — гэта расшырэнні сасудаў, выпаўненыя крывёй. Пры лёгкім націсканні яны спадаюць, бляднеюць.

Яшчэ больш бяскрыўднымі змяненнямі скуры, якія трэба размяжоўваць з сапраўднымі невусамі і радзімымі знакамі, з'яўляюцца розныя ўнутрыскураныя цвёрдыя вузялкі. Да іх адносяцца фібромы, нейрафібромы, папіломы скуры, мазалі, пігментаваныя рубцы пасля апёкаў, траўм і інш.

Нярэдка фіброма скуры вельмі нагадвае пігментную пляму. У такіх выпадках у дарослых людзей з'яўляюцца зацвярдзенні на скуры ў выглядзе вузялкоў, якія пасту-

пова павялічваюцца і нават цямнеюць. Хоць такое зацвярдзенне нічым іншым сябе не праяўляе, аднак можа закрадвацца думка, што гэта, магчыма, пігментны невус. На самай справе гэта вузлаватае разрастанне фібрознай тканкі з сасудзістым ці неўрагенным кампанентам. Для такіх утварэнняў на скуры характэрна наступнае: нейра- і ангіяфібромы заўсёды больш цвёрдыя, чым іншыя пігментныя плямы. Пры гэтым асноўная маса вузялка размяшчаецца глыбей, а скура як бы ўцягваецца над ім і ў цэнтры гэтага месца набывае больш цёмную афарбоўку. У радзімых знаках і нават набытых пігментных плямах уцяжэнняў скуры звычайна не бывае, яны выступаюць над узроўнем скуры, а выразнасць граніцы пігментацыі залежыць ад памераў плямы. Усё гэта вельмі важна для дыферэнцыяльнай дыягностыкі невусаў і пігментаваных нейрафібром скуры, якія не ўяўляюць ніякай небяспекі, і іх можна не выдаляць.

Важна ведаць, што часам у невялікай чырвонай сасудзістай пляме ўтвараюцца згусткі крыві і можа з'явіцца цёмная пляма ад жалеза, якое вызвалілася з гемаглабіну і акіслілася ў гемасідэрын. У такіх выпадках ангіёма знешне вельмі падобна да пігментнай плямы ці радзімага знака з неспрыяльным цячэннем.

Уважлівы агляд ангіяпапілом дазваляе заўсёды выявіць у іх дробныя галінкі крываносных сасудаў, якія асабліва прыкметны пры лёгкім націсканні. Пад павелічальным шклом ці лупай больш выразна відаць згусткі крыві, якія ўяўляюць дробныя чорныя кропкі, размешчаныя пераважна ў паверхневых слаях. Асновы такіх ангіём звычайна без цёмных уключэнняў і больш аднародныя.

У сапраўдных невусах пігмент, наадварот, размяшчаецца ў больш глыбокіх слаях, гэта значыць у аснове, а часам дыфузна прапітвае ўсю пляму, тады па перыферыі адзначаецца паблядненне без сасудзістага малюнка.

Устанавіць сапраўдную прыроду зусім чорнага і падобнага да меланомы ўтварэння, але з абсалютна дабраякасным цячэннем, лягчэй, калі ведаеш, якім яно было раней.

Паказальны ў гэтых адносінах адзін выпадак, калі маці, па прафесіі ўрач, заўважыла ў сына на грудной клетцы цёмную кропкавую плямку, якая літаральна за некалькі дзён набыла чорны колер. Бацькі прывялі сына на кансультацыю ўжо з пастаўленым імі дыягназам меланомы. Цяжка было пераканаць іх у тым, што гэта не меланома. Калі ў спакойных абставінах распыталі хлопчыка, ён расказаў аб тым, што ў яго раней на гэтым месцы была чырвоная плямка, якая чамусьці пацямнела. Дынаміка змяненняў колеру плямы пераконвала ў тым, што гэта кровазліццё ў сасудзістую пляму з утварэннем у ёй згустка крыві. Так яно і было. Праз некалькі дзён чорная плямка падсохла і злушчылася.

Гэта назіранне пацвярджае, што не ўсе чорныя плямы на скуры сведчаць аб меланоме. І наадварот, часам пасвятленне плямы можа наглядацца пры развіцці яшчэ больш небяспечнай так званай безпігментнай меланомы.

Прыводзім адзін такі выпадак.

Юнак на плячы выпадкова садраў барадаўку амаль такога ж колеру, як і скура, але не надаў гэтаму значэння і нават забыўся, што гэта было. Праз паўгода ён заўважыў, што ў яго павялічыліся лімфатычныя вузлы ў падпахавай вобласці на тым жа баку. З гэтым юнак і звярнуўся за медыцынскай дапамогай. Аднак урач, да якога прыйшоў малады чалавек, не распытаў яго падрабязна аб пачатку захворвання, а пацыент сам не расказаў, што раней садраў барадаўку на плячы. Павялічаныя лімфатычныя вузлы прынялі за самастойнае захворванне і выдалілі іх. Усе яны былі запоўнены чорнай масай. Як высветлілася, гэта былі метастазы меланомы, якая развілася з раней садранай безпігментнай барадаўкі.

У метастазах была вялікая колькасць чорнага меланіну. На вялікі жаль, нягледзячы на ўсе намаганні ўрачоў, хворы загінуў ад шматлікіх метастазаў у лёгкія і іншыя органы.

Прыведзеныя назіранні сведчаць, што як пігментныя, так і безпігментныя зацвярдзенні на скуры трэба паказваць урачу, бо кожнае з іх можа перарадзіцца калі не ў меланому, то ў якую-небудзь іншую злаякасную пухліну. Напрыклад, рубцы, якія зацвердзяваюць ці пакрываюцца болькамі пасля апёкаў ці раней існаваўшых свішчоў, часам цямнеюць і нагадваюць пігментныя плямы. Аднак з іх развіваецца не меланома, а рак скуры, які таксама, калі яго не лячыць, прыводзіць да сумных вынікаў.

## МЕТАДЫ РАСПАЗНАВАННЯ ПІГМЕНТНЫХ ПЛЯМ І МЕЛАНОМ

У цяперашні час існуе шмат метадаў распазнавання пігментных плям пры неспакойным іх цячэнні. Гэта клінічныя, лабараторныя, ізатопныя і інструментальныя даследаванні. Асноўным метадам распазнавання ўсіх новаўтварэнняў, у тым ліку пігментных плям і меланом, з'яўляецца клінічны. Ён заснаваны на правільным аналізе ўсёй інфармацыі, якую паведамляе пацыент, дэтальным аглядзе і далікатнай пальпацыі пігментнай плямы або якога-небудзь іншага ўтварэння на скуры.

Вялікае значэнне надаецца ізатопным метадам даследавання. Вядучым з іх з'яўляецца фосфарная дыягностыка. Прынцып яе ў тым, што пігментныя плямы, асабліва меланомы, назапашваюць радыёактыўны фосфар у значна большай колькасці, чым звычайная, без змен скура. Пры гэтым велічыня і тэмпы паглынання фосфару ў пігментнай пляме тым вышэй, чым больш у ёй абменных

парушэнняў, якія залежаць ад запалення ці злаякаснага пераўтварэння, гэта значыць малігнізацыі.

Ізатопная дыягностыка невусаў і меланом абсалютна бясшкодная і лёгка пераносіцца. Яна так зарэкамендавала сябе на практыцы, што цяпер лічыцца абавязковым метадам даследавання перад вырашэннем пытання аб выбары тактыкі найбольш спрыяльнага спосабу лячэння. У комплексе з іншымі метадамі даследавання ізатопная дыягностыка з'яўляецца вядучай. Яна дазваляе выяўляць раннюю малігнізацыю невусаў і запаленчыя змяненні ў пігментнай пляме.

Так, у хворай В., 46 год, з дзяцінства было шмат пігментных утварэнняў па ўсяму целу ў выглядзе невялікіх плоскіх плямак. Адна з іх на плячы за паўгода прыкметна павялічылася і пацямнела. Пры ізатопнай дыягностыцы выявілася значнае накапленне ў ёй радыёактыўнага фосфару, якое стойка ўтрымлівалася на высокіх лічбах на працягу ўсяго тэрміну абследавання. Гэта з'явілася падставай для пастаноўкі дыягназу «меланома», хаця павелічэнне і пацямненне плямы клінічна таксама выклікала вялікае падазрэнне на злаякаснае яе перараджэнне. Хворай было праведзена неабходнае камбінаванае лячэнне, і пасля гісталагічнага даследавання выдаленай пухліны пацвердзіўся дыягназ меланомы ў пачатковай стадыі развіцця. Як відаць, асноўная роля ў ранняй дыягностыцы ў даным назіранні належыць ізатопнаму даследаванню.

З лабараторных метадаў у дыягностыцы меланом пэўнае значэнне надаецца вызначэнню ў мачы меланіну — пухліннага пігменту, які, пападаючы ў кроў, стварае меланемію і затым, пранікаючы праз ныркі, выдаляецца з мачой. У выніку адзначаецца так званая меланурыя. І хоць мача пры гэтым звычайна колеру не мяняе, спецыяльнымі рэакцыямі ў ёй можна выявіць меланін.

Для марфалагічнай дыягностыкі меланом выкары-

стоўваюцца абсалютна бясшкодныя способы даследавання, якія не прычыняюць якога-небудзь раздражнення, у прыватнасці ўзяцце мазкоў-адбіткаў. Калі пігментная пляма пакрываецца болькамі ці кроваточыць, з яе паверхні можна ўзяць мазкі-адбіткі шляхам лёгкага дакранання покрыўным шклом. У гэтых мазках нярэдка цыталагічным метадам пад мікраскопам можна выявіць пухлінныя клеткі.

У выпадках лушчэння невусаў таксама можна ўзяць лускавінкі для цыталагічнага даследавання або зрабіць адбіткі з пухліны пасля лёгкага саскрабання лускавінак з яе паверхні.

Біяпсія, або пракол, пухліны з мэтай узяцця матэрыялу для аналізу да аперацыі катэгарычна забараняецца. Аднак пасля выдалення любой пігментнай плямы ці радзімага знака біяпсію неабходна выконваць абавязкова ва ўсіх выпадках, таму што толькі мікраскапічнае даследаванне дазваляе канчаткова ўдакладніць дыягназ, а значыць, і дадатковае лячэнне.

## СПОСАБЫ ЛЯЧЭННЯ ПІГМЕНТНЫХ УТВАРЭННЯЎ СКУРЫ

Для лячэння радзімак і пігментных плям ужываюцца розныя спосабы, якія можна аб'яднаць у дзве групы: хірургічнае выдаленне ачагоў паражэння і разбурэнне іх на месцы. Хірургічныя спосабы ўключаюць простае выдаленне плям скальпелем ці электрахірургічнае высячэнне іх. Да метадаў, якія разбураюць пігментны ачаг на месцы, адносяцца: электракаагуляцыя, крыятэрапія шляхам замаражэння вуглекіслатой, прамянёвая тэрапія рэнтгенавымі ці радыевымі праменнямі. Кожны спосаб прызначаецца пры пэўных паказаннях, і выбраць яго правільна можа толькі ўрач. Асноўная мэта лячэння — дасягнуць спачатку надзейных лячэбных вынікаў,

а затым — касметычнага эфекту. Першараднымі ў лячэнні радзімак і невусаў павінны быць медыцынскія паказанні, а затым ужо пажаданні пацыентаў па касметычных меркаваннях.

Медыцынскімі паказаннямі для выдалення невусаў з'яўляюцца перш за ўсё неспрыяльныя іх лакалізацыі, гэта значыць размяшчэнне ў месцах пастаяннага раздражнення адзеннем (на шыі, жываце, валасістай часткі галавы і інш.). Пры лакалізацыі невусаў ці радзімак у гэтых месцах найбольш часта ўзнікаюць паказанні для іх выдалення. На наш погляд, перавагу трэба аддаваць хірургічнаму высячэнню, якое выконваецца вельмі хутка, і гаенне пасля яго адбываецца таксама хутка. Аднак пасля высячэння радзімкі ці плямы застаецца рубец. Таму на твары мэтазгодна прымяняць іншыя, больш ашчадныя ў касметычных адносінах спосабы. Да іх належаць электракаагуляцыя і прамянёвая тэрапія.

Калі радзімка мае тонкую аснову, гэта значыць вісіць як быццам бы на ножцы, то яе лепш за ўсё адсячы электранажом, а аснову затым скаагуліраваць. Гэта дазваляе сфарміраваць гладкі і амаль непрыкметны эластычны рубчык, які з цягам часу набывае выгляд нармальнай скуры. Калі ж радзімка ці пляма мае тоўстую аснову, адсячы іх электранажом даволі цяжка, а больш шырокая каагуляцыя суправаджаецца значным апёкам і фарміраваннем грубага рубца. Радзімкі з такой асновай на твары лепш за ўсё лячыць прамянёвым спосабам, гэта значыць шляхам абпраменьвання рэнтгенаўскімі праменнямі.

Праўда, гэты спосаб лячэння больш працяглы. Прамянёвая тэрапія праводзіцца штодзённа на працягу 2—3 тыдняў, але яна дазваляе атрымаць добры лячэбны эфект і касметычныя вынікі: застаецца толькі гладкі паверхневы рубец, які амаль не адрозніваецца ад нармальнай скуры. Асабліва добрыя вынікі дае прамянёвая тэрапія на шчоках, кончыку носа і паблізу павек. Гэта

лячэнне звычайна праводзіцца ў спецыялізаваных установах, часцей за ўсё ў анкалагічных дыспансерах.

Аднак лучавая тэрапія радзімак і невусаў на валасістай частцы галавы з касметычнага пункту гледжання дае горшыя вынікі. Пасля абпраменьвання наступае аблысенне таго месца, якое падвяргалася прамянёвай тэрапіі. Таму на валасістай частцы галавы пігментныя ўтварэнні мэтазгодней высякаць. Тут добра загойваецца аперыраванае месца, а невялікі рубец, які пасля гэтага ўтвараецца, пад валасяным покрывам нябачны.

Такім чынам, метад лячэння радзімкі ці пігментнай плямы выбіраецца ў залежнасці ад лакалізацыі, памераў, знешняй формы і тых паказанняў ці матываў, у сувязі з якімі прымаецца рашэнне выдаліць іх ці разбурыць.

Як вядома, магчымы і іншыя спосабы лекавага ці медыкаментознага лячэння пігментных утварэнняў, у прыватнасці хімічныя. Часам лічаць, што яны менш траўматычныя і больш надзейныя. Аднак гэта не заўсёды так, а пры лячэнні радзімак далёка не так.

Паверхневыя невялікія плямы з празмерным лушчэннем, а таксама дробнапапілярныя варсінчатыя невусы часам паддаюцца лячэнню гарманальнымі прэпаратамі: аксікортам, прэднізалонавай, гідракарцізонавай мазямі і іншымі. Пры ангіёматозных невусах, калі яны плоскія і невялікія, ужываецца, як і пры чыстых ангіёмах, абкалванне іх спіртам з мэтай хімічнай каагуляцыі ці замарожванне вуглекіслатой. Апошні спосаб крыатэрапіі выгадны тым, што ён безбалесны, лёгкадаступны, нават у дзяцей, і можа ўжывацца паўторна, даючы нядрэнныя вынікі пры павярхоўна размешчаных невусах, ангіёмах і папіломах. Гэты спосаб даволі часта выкарыстоўваецца ў касметычных кабінетах.

Лячэнне такіх невусаў, пры якіх неабходна спачатку ўстанавіць, ці не перарадзіліся яны ў злаякасныя, праводзіцца толькі ў спецыяльных установах і лепш, калі ў

стацыянары. Толькі там можна аказаць неабходную дапамогу хвораму з улікам апошніх дасягненняў навукі.

* * *

Ад насельніцтва патрабуецца надаваць больш увагі свайму здароўю і своечасова звяртацца да ўрача з любымі прыкметамі неспакойнага цячэння радзімкі ці пігментнай плямы, якія нельга зрэзваць, перавязваць, выпальваць кіслотамі або шчолачамі. Гэта небяспечна для жыцця.

**Цішчанка М. А.**

Ц 75 Пігментныя ўтварэнні на скуры і іх злаякаснае перараджэнне. Мінск, «Беларусь», 1976.

32 с. з іл. (Санітарныя веды — у масы).

У брашуры расказваецца аб пігментных утварэннях на скуры, аб іх магчымым змяненні і злаякасным перараджэнні. Даюцца парады па прафілактыцы і лячэнню гэтых утварэнняў у выпадку неабходнасці.

Брашура разлічана на масавага чытача.

Ц $\frac{51800}{М\ 301(05)-76}$ 617.8

На белорусском языке

**Николай Афанасьевич Тищенко**

**ПИГМЕНТНЫЕ ОБРАЗОВАНИЯ НА КОЖЕ И ИХ ЗЛОКАЧЕСТВЕННОЕ ПЕРЕРОЖДЕНИЕ**

Рэдактар *О. С. Лукашонак.* Мастак *О. І. Раманцоў.* Мастацкі рэдактар *В. П. Бязмен.* Тэхнічны рэдактар *Г. І. Хмарун.* Карэктар *Л. Б. Тавачэнка.*

АТ 10480. Здадзена ў набор 1/IV 1976 г. Падп. да друку 1/VI 1976 г. Тыраж 50 000 экз. Фармат 70×108¹/₃₂. Пепера друк. № 1. Ум. друк. арк. 1,4. Ул.-выд. арк. 1,28 Зак. 3144. Цана 5 кап.

Выдавецтва «Беларусь» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Ленінскі праспект, 79.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Чырвоная, 23.

5 к.